Анатоль Матвіенка Алена Стэльмах

# Як сябры будавалі човен



Казка з заданнямі

Анатоль Матвіенка
Алена Стэльмах

# Як сябры будавалі човен



Казка з заданнямі

Мінск
«Беларусь»
2021

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
М33

Мастак Ян Мяльніцкі

*Для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**ISBN 978-985-01-1494-5**

© Матвіенка А. Я., Стэльмах А. А., 2021
© Мяльніцкі Я. Л., ілюстрацыі, 2021
© Афармленне. УП «Выдавецтва «Беларусь», 2021

Стаяў пагодлівы летні дзянёк. Яркае сонейка з высокага неба пасылала на зямлю свае зіхоткія праменьчыкі. І тыя навыперадкі спяшаліся шчодра падзяліцца сваім цяплом з травой, кветкамі, дрэвамі. Нагрэўся нават пясочак, не кажучы ўжо пра водную роўнядзь возера Белага. Блакітна-празрыстая вада ў ім стала гэткай жа цёплай, як сырадой — пачастунак ад малочніцы-каровы. Дарэчы, рагатыя красулі пасвіліся непадалёку, на стракатым лузе. Час ад



часу па ўсім наваколлі разносілася іх мілагучнае «му-у-у!». Здавалася, кампанейскія кароўкі таксама хацелі далучыцца да весялосці, якая панавала на беразе Белага.

Ля возера адпачывалі сябры, якія даўно не бачыліся. І вось зараз, сабраўшыся разам, яны вельмі цікава бавілі час: бегалі навыперадкі, валтузіліся, ганялі ў футбол. Стаміўшыся, селі кружком, каб паадгадваць займальныя загадкі.

У вадзе адпачывальнікі звычайна паводзілі сябе вельмі асцярожна. Хоць і хацелася зайсці глыбей, і сёй-той нават адважваўся зрабіць невялічкі заплыў, усё ж кожны памятаў пра небяспеку, якую таіла ў сабе прахалоднае возера.



І раптам агульны прыўзняты настрой парушыў трывожны крык. Ён даносіўся з сярэдзіны возера, куды нядаўна на гумавым надзіманым чоўніку ўпотай паплыў Цішка, аблавухі сабачка пароды ньюфаўндленд. Дарэчы, ягоны бацька, здаровы чорны сабака Януш, працаваў на тутэйшай ратавальнай станцыі.

— Авой, мабыць, перавярнуўся човен?! — першым ацаніў сур'ёзнасць сітуацыі мудры бык Восіп. — Хутчэй бяжыце за ратавальнікамі! — скамандаваў ён.

Да будкі, у якой месцілася станцыя, імгненна кінулася маладзенькая козачка Марта. На яе шыі вісеў званочак, які гучна абвяшчаў пра здарэнне.

У той адчайны момант вяртлявая вавёрачка Кася маланкай скокнула на самую высокую сасну, каб высветліць дакладна, хто кіраваў перавернутым чоўнам. У пырсках, якія ляцелі ва ўсе бакі, яна ўбачыла знаёмую галоўку з закругленымі вушкамі. Не было і сумневу: на самым глыбокім месцы, на вялікай адлегласці ад берага боўтаўся Цішка.

Кася ў вокамгненне спусцілася з дрэва. Яна тут жа паведаміла дружбакам: як яны і думалі, бяда здарылася са шчанюком. Занепакоеныя сябры не зводзілі вачэй з той кропкі, якая, пускаючы вялікія кругі па вадзе, марудна набліжалася да берага. Фыркаючы і малоцячы лапамі, Цішка ўпарта плыў наперад. У сабак гэтай пароды, у адрозненне ад іншых, тоўсты хвост у вадзе можа служыць замест

руля. Таму і Цішку ў гэты катастрафічны момант ён выручаў.

— Хоць бы хапіла ў яго сілы! Ён жа яшчэ зусім малы… — з затоеным дыханнем сачылі за небаракам усхваляваныя сябры.

— Цішка, грабі хутчэй! — мітусілася туды-сюды па залатым пясочку Кася. — Вось ужо бацька табе ўсыпле! — прыгаворвала яна, упэўненая, што гэта будзе вельмі справядліва.

Вавёрачка асабліва хвалявалася за Цішку. Яны часта бавілі час разам. Добразычлівы і спагадлівы Цішка, калі яму перападала якая смаката, абавязкова дзяліўся ёю з Касяй. А тая па-свойму дзячыла шчаняці: насіла яму з дупла назапашаныя арэшкі.



Ратавальнік дзядзька Януш убачыў здалёк козачку Марту, на шыі якой усё больш трывожна заліваўся званочак. Янушу хапіла гэтага сігналу, каб зрабіць некалькі шырокіх скачкоў і імгненна апынуцца ля дзяжурнага катара. Паветра ўскалыхнулася ад гуку заведзенага матора. Усе ўбачылі, як выратавальны катар ірвануў ад прыстані і скіраваўся насустрач бядотнаму плыўцу.

Літаральна праз некалькі хвілін Януш дастаў з вады на борт мокрага, знясіленага Цішку. Сам па сабе ратавальнік быў вельмі добрым сабакам і лагодным бацькам. Але гэты ўчынак сына яго дужа раззлаваў. Ён столькі разоў папярэджваў малога не шуткаваць з вадой, забараняў яму аднаму плаваць у возеры, і на табе — такое свавольства! Бяздумнасць Цішкі ледзьве не давяла да сур'ёзнай бяды.

Калі катар прычаліў да берага, Януш перанёс сына ў станцыйную будку. Цішка, разумеючы сваю віну, забіўся ў кут і пазіраў на бацьку жаласлівымі вачыма. Ад бездапаможнасці сына, уявіўшы, колькі страху той нацярпеўся, бацька памякчэў. Не паказваючы выгляду, што ён адпусціўся на малога (хаця без увагі гэты выпадак, канешне, не застанецца), Януш лагодна абхінуў сына мяккай коўдрачкай, даў папіць цёпленькага малачка і строга загадаў не рушыцца з месца. Яму самому неабходна было вярнуцца туды, дзе застаўся перавернуты човен, каб прыгнаць яго да берага.



## А мы разбяромся, чаму перакулены човен не патануў.

Можна ўзяць звычайны шарык і надзьмуць яго. Апусціце яго ў ваду і ўбачыце: ён не тоне, толькі апускаецца ледзь-ледзь.

### Чаму?

У шарыку знаходзіцца паветра. Яно, у параўнанні з вадой, амаль нічога не важыць. Вада больш шчыльная, яна выштурхвае шарык наверх. Але калі паветра выпусціць, абалонка апусціцца на дно.
Так і надзіманы човен. У яго ў бартах – паветра. Цішка мог проста трымацца за борт і чакаць выратавання. Але калі надзіманы човен праб´е борт аб якое-небудзь смецце, будзе бяда. Паветра спусціцца, лодка патоне. Таму значна надзейней човены з цвёрдых матэрыялаў. Напрыклад – з дрэва.



Сябры не бачылі Цішку цэлы дзень. Яны думалі, што гэта раззлаваны бацька забараніў яму выходзіць з двара. Але, як высветлілася, Януш паўшчуваў неразумнага шчанюка, аднак, паверыўшы яго абяцанню больш не рызыкаваць, адступіўся. Насамрэч сядзець дома Цішку вымусіла горла, якое балела пасля пераахалоджвання ў возеры. Неабходна было падлячыцца.

Па праўдзе кажучы, Цішка не надта мкнуўся на вуліцу і таму, што адчуваў няёмкасць перад сябрамі. Здураваў ён: махануў на самую сярэдзіну возера, хаця ведаў, што не варта гэтага рабіць. Гумавы човен не вытрымаў набегу шпаркай хвалі ды і перакуліўся. Але што паробіш, калі ёсць у Цішкі запаветная мара: убачыць незвычайную казачную краіну, пра якую яму так шмат распавядала ўсё тая ж рудахвостая вавёрачка Кася.

Дарэчы, вавёрчына хатка-дупло была якраз у ствале згаданай раней стромкай сасны. Кася любіла ўзбірацца на самую яе вершаліну, якая амаль падпірала аблокі, і зоркімі вочкамі аглядаць далёка распасцёртае наваколле. Яна даўно заўважыла, што на тым беразе возера Белага ёсць высозныя вежы з сінімі, ружовымі, блакітнымі стрэхамі. Над імі гойдаюцца рознакаляровыя паветраныя шарыкі. На галоўнай вастракутнай вежы вісіць гадзіннік, стрэлкі якога кожную гадзіну пераводзяць вясёлыя гномы.



Жыхары той краіны ведаюць, што шарыкі будуць трымацца цалюткімі толькі тады, калі іх дзеці здзяйсняюць добрыя ўчынкі. Варта каму-небудзь нашкодзіць, як шарык адразачку здзімаецца. Кожны раз, калі Кася вяла свой пільны дазор, Цішка, задзіраючы голаў уверх, з хваляваннем у яе пытаўся: «Ну, як там шарыкі? Ці ўсе на месцы?» І скакаў ад задавальнення, калі Кася ў адказ кідала яму шышку, што азначала: «Не хвалюйся, у казачнай краіне поўны парадак».

Як жа хацелася Цішку патрапіць туды самому, на свае вочы пабачыць самых паслухмяных дзяцей! Часта, лежачы ў сваёй утульнай будачцы, ён уяўляў, як знаходзіць у казачнай краіне новых сяброў. А яшчэ марыў, што ў небе з'явіцца і ягоны шарык: ён жа паслухмянае шчаня!

Вось таму, калі Цішка ўбачыў ля берага некім пакінуты без нагляду гумавы чоўнік, ён вырашыў рызыкнуць — паплыць у чароўную краіну. Малы нават не мог уявіць, як моцна за яго стануць перажываць сябры. Асабліва няёмка было перад Касяй. Што яна пра яго падумае? Што ён слабак? Недарэка? І таму калі ўбачыў мільгануўшы за плотам знаёмы пухнаты хвост, вельмі ўзрадаваўся.

Кася ціхенька пастукала ў брамку. Цішка паспрабаваў прыўзняць клямку, але тая не паддалася. Ад адчаю ён ледзь не заплакаў. Ну чаму так не шанцуе? Зноў перад Касяй асечка… Але ў рэшце рэшт ён падцягнуўся на дыбачках, сабраўся з усімі сіламі — і клямка падскочыла ўверх, а брамка гасцінна расчынілася.



Кася, трымаючы ў лапках бочачку мёду, усміхалася аксамітнымі бусінкамі-вочкамі. Цішка, убачыўшы мілую сяброўку, адчуў радасць і асалоду, магчыма, прыемнейшую, чым ад мёду.

— Мне твой бацька сказаў, што у цябе баліць горла. Дзядзька Міша прасіў перадаць табе лекі… —



Кася працягнула Цішку пузаценькую бочачку і знікла так хутка і амаль незаўважна, як гэта ўмела рабіць толькі яна.

На наступны дзень Цішка адважыўся прайсціся па вуліцы. Першым ён убачыў бабраня Яшку. На той момант шчанюк лепш бы абышоў яго бокам, але той сам зачапіў яго:

— Прывітанне, марскі воўк! Ну як? Добра папла-ваў?



Хіба ж Цішку надта хацелася адказваць на гэта кплівае пытанне? Ён нешта прабубнеў сабе пад нос і, магчыма, пайшоў бы далей, але тут згадаў пра човен, які, як казаў калісьці Яшка, яны маглі б пабудаваць разам.

Бабёр ведаў, як сябру карцела адправіцца ў падарожжа. І хто, як не ён, Якаў-малодшы, мог дапамагчы шчанюку ў гэтым! На ўвесь свет вядома, якія бабры заўзятыя майстры розных вырабаў з дрэва. Іх нездарма называюць рачнымі інжынерамі.

Цішка, зразумела, абняславіўся сваім няўдалым плаваннем, але жаданне дабрацца да вабнай краіны яшчэ больш яго захапіла. І таму ён вырашыў усё ж прыпыніцца ля сябра.

— Ды ўжо ж. Пасляшаўся, — схіліўшы галаву, прызнаўся Цішка. — Дужа хочацца пабываць у той загадкавай краіне… — Ён зморшчыўся і пачасаў лапай за сваім абвіслым вухам.

— Хто ж адпраўляецца ў падарожжа такім непадрыхтаваным? — пасарамаціў сябра Яшка. — Ты хіба не ведаеш, што для мараплаўцы надзвычай важны надзейны плавальны сродак? Колькі чаўноў і нават вялікіх караблёў цярпела крушэнне, бо іх кіроўцы, як і ты, абыякава ставіліся да свайго судна! Водная стыхія часам паводзіць сябе вельмі непрадказальна. Мараход да ўсяго ж павінен быць моцны духам!

Яшка, паставіўшы лапы ў бокі, як выбітны знаўца водных спраў, павучаў сябра. А той уважліва ўслухоўваўся ў сур'ёзную прамову бабра, бо неаднойчы дзівіўся ягонаму майстэрству ныраць і рабіць у вадзе розныя выкрутасы: той возера пераплыве і не патоне. Не, ім, сабакам, у гэтай справе з бабрамі не раўняцца...

Ведае Цішка, і дзе месціцца хатка, у якой жыве Яшкава дружная сямейка. Гэта ж колькі трэба было рэзаць і цягаць дрэў ды галля, умела іх змацоўваць, каб атрымалася такая ўтульная хаціна! Дома ў Яшкі ўсе рэчы з дрэва, і нават тэлевізар, толькі экран шкляны. І браты ў яго таксама вельмі добрыя сябрукі. Увогуле, Яшка быў для шчанюка вялікім аўтарытэтам. І зараз ён адвадзіў Цішку ад сумных думак.

— Дык можа б мы і праўда човен змайстравалі? Як ты кажаш, самы надзейны? — працягнуў гаворку пасмялелы Цішка.

— А чаму б і не? Я і раней табе пра гэта казаў. А ты не паслухаўся, схапіў чужое. Хіба можна браць тое, што табе не належыць? — Яшка паказваў і далей сваю бабрыную мудрасць.

— Давай заўтра на досвітку сустрэнемся ля старой бярозы-шаптухі. Мы, бабры, за справу рана бяромся. Там майстраваць човен і пачнём! — прапанаваў Яшка.



— Выдатна, — падтрымаў сябра Цішка і, сумеўшыся, дадаў: — А можна Касю таксама запрасіць?

— Ну вядома! Яна вавёрачка дужа спагадлівая. Ведаю: хто б яе аб чым ні папрасіў — дапаможа, — не раздумваючы пагадзіўся Яшка.

На гэтым яны і развіталіся.

Цішку свярбела хутчэй знайсці сяброўку і паведаміць пра іх з Яшкам сакрэт. Не марудзячы, ён падаўся ў бок сасны.





«Нават калі Касі не будзе дома, буду чакаць колькі спатрэбіцца. Як жа заўтра без яе брацца за човен? Кася абавязкова нешта падкажа. Яна ж такая разумніца!» — разважаў Цішка і амаль незаўважна дабрыў да сасны.

— Прывітанне! — пачуўся над галавой знаёмы голас.

Кася якраз парадкавала высушаныя на зіму грыбы. Яна ўбачыла сябра яшчэ здалёк, калі выглянула з дупла. Прыхапіўшы жменьку арэшкаў, вавёрка паскакала яму насустрач.

— Прывітанне, Кася! — адчуваючы сябе ніякавата, прамовіў Цішка. — Ты мяне прабач. Сорамна мне перад усімі вамі…

— Ніхто, Ціша, на цябе не крыўдуе, — суцешыла яго вавёрачка. — Але болей ты так не рабі. Думай, узважвай, перш чым за якую справу хапацца.

— А мы ж з Яшкам якраз і падумалі! — узрадаваны такой Касінай спагадлівасцю, Цішка на адным дыханні выклаў намечаны план.

Сяброўка ўважліва выслухала яго і выказала сваё меркаванне:

— Выдатная ідэя! Калі ў нас будзе сапраўдны човен, мы ўсе разам зможам падарожнічаць. Я таксама хачу патрапіць у чароўную краіну. Думаю, і Яшка будзе не супраць паплыць з намі. З улікам яго досведу, мо няхай ён стане нашым капітанам?



А мы ўспомнім, на чым людзі
і звяры плаваюць па вадзе.

Самыя вялікія караблі – акіянскія. Тыя, што менш, ходзяць па буйных рэках ды азёрах. Яшчэ менш — гэта катары і чаўны.



— Ты, Кася, як заўсёды малайчына! — усклікнуў Цішка. — Выдатная прапанова! Заўтра адразу пра гэта скажам Яшку.

— Частуйся, калі ласка! — Вавёрка працягнула сябру арэшкі.

— Маё шанаванне табе, Касечка! І дзядзьку Мішу перадай шчыры дзякуй. Яго мядок мяне хутка вылечыў, — Цішка ў знак вялікай павагі завіляў хвосцікам. Узрадаваны тым, што ўсё кепскае мінула, ён пабег дамоў. У кішэньцы весела пастуквалі Касіны арэшкі.

Цішка прачнуўся, калі ледзь пачало днець. Напярэдадні лёг ён позна. Добра вядома, якія сабакі старанныя вартаўнікі. З учарашняга дня яго не пакідала думка, што б такое прыемнае зрабіць для Касі. Вунь як яна за яго турбавалася, клапацілася аб ім! Як жа ёй аддзячыць? Яго перапаўнялі пачуцці, але нічога талковага ў галаву не ішло.

Цішка памятаў пра Яшкаў загад раніцай не марудзіць. Ён накіраваўся знаёмай сцяжынкай да бярозы-шаптухі. Шлях да яе ляжаў праз усыпаны маленькімі брыльянтавымі кропелькамі луг, на якім каровы з асалодай жавалі сакавітую траву. Яны павіталі Цішку сваім любімым «му-у-у!». Той са свайго боку таксама праявіў ветлівасць: па наваколлі разнеслася яго звонкае «гаў, гаў!». І тут ён згледзеў, як у адказ пачалі ківаць сваімі галоўкамі рамонкі і валошкі, а званочкі да таго ж зладзілі вясёлы перазвон. Бліснула думка: ён нарве кветак і падаруе іх чароўнай вавёрачцы Касі! Букет атрымаўся найшыкоўнейшым, і Цішка неўзабаве ўжо тантаўся ля бярозы-шаптухі.



Хутка з'явіўся і Яшка.

— Малайчына, нават раней за мяне, — пахваліў бабёр пунктуальнага сябра. — А што гэта ў цябе? — запытаўся ён, згледзеўшы, як той нешта хавае за спіной.





— Ды так, — сумеўся Цішка. Яму было няёмка прызнацца, што прынёс букет.

Дзелавы Яшка прапусціў міма вушэй Цішкава мармытанне, яго займала сваё:

— Перш за ўсё нам трэба для чоўна назапасіць матэрыял, — з веданнем справы павучаў бабёр.

— Гэта так, — падтрымаў яго Цішка, які, па праўдзе кажучы, не ведаў, з чаго пачынаць такую адказную работу, як майстраванне чоўна.

— Я дамовіўся са сваімі братамі. Яны нам дапамогуць, — выказаў Яшка ўпэўненасць у тым, што справа заладзіцца.



Цішка не паспеў як след адрэагаваць на гэту цудоўную навіну, бо з-за павароту з'явілася Кася. Ён, працягваючы букецік, падаўся ёй насустрач. Вавёрка какетліва ўсміхнулася, як умеюць гэта рабіць дзяўчынкі, і сарамліва апусціла вочкі. Букецік ёй быў вельмі даспадобы.

Такая мілата кранула і сур'ёзнага Яшку. Нездарма кажуць, што бабры вельмі чуллівыя. Яны ўмеюць плакаць, крыўдзіцца (тады выпінаюць губу) і шчыра выказваюць сваю радасць.

Невядома, як бы паводзілі сябе сябрукі далей, але ініцыятыву перахапіла Кася:

— Не ведаю як ты, Яша, а мы з Цішкам вельмі хочам адправіцца ў падарожжа. Каб ты пагадзіўся



плыць з намі, дык быў бы за капітана. Вы, бабры, як вядома, крутыя хлопцы!

— Так-так, мы будзем вельмі рады! — вільнуўшы хвастом, пацвердзіў слушную прапанову Цішка.

Заставалася пачуць адказ ад самога Яшкі, як у гэты момант з-пад даўжэзных галін бярозы-шаптухі, што хіліліся да самай вады, з'явілася адна галава, а за ёй другая, трэцяя... Бабры замерлі на імгненне, пасля чаго дружна пляснулі хвастамі па вадзе і зніклі, пакінуўшы на азёрнай роўнядзі вялікія кругі.



— Гэта браты мае, — адрэкамендаваў сябрам плыўцоў Яшка. — Яны далі знаць, што крыху пад-востраць пілы і возьмуцца за работу: назапасяць нам бярвення. Вунь колькі прыдатных вольхаў, дубоў ды елак вакол! Звычайна гэтыя дрэвы мы выкарыстоўваем на будаўнічыя патрэбы. А вось частавацца любім больш мяккімі пародамі: бярозай, таполяй, вярбой.

Сапраўды крыху воддаль пачулася рыпенне, што азначала — бабры востраць свае пілы.

— Дрэва цяжкое, — разважліва заўважыў Цішка. — Патануць можа. — Напалоханы сваім няўдалым вопытам, шчанюк цяпер вельмі абачліва ставіўся да будаўніцтва новага судна.

— Драўляны човен — гэта не твой гумавы надзіманчык, — перабіў яго Яшка. — Ён больш устойлівы, не перакуліцца. І ведаеш чаму? Бервяно не тоне ў вадзе, бо вага дрэва меншая, чым вага вады таго ж аб'ёму, — з дакладным веданнем справы патлумачыў бабёр і працягнуў: — Ты ж бачыў, колькі мы, бабры, вакол возера Белага хат набудавалі, і плацін тут хапае. Гэтаму мяне вучыў мой бацька, а яго — ягоны бацька. Так у нас тысячы гадоў з пакалення ў пакаленне вядзецца: малодшыя ад старэйшых майстэрства пераймаюць. Вось і інструмент сямейны маю, — Яшка паказаў на вялікую скрыню, што стаяла побач. — Будзь спакойны, з чоўнам не прагадаем.

— Што ты, Яша, мы табе давяраем болей, чым сабе! — падтрымаў сябра Цішка. — Ты вось толькі не адказаў, ці згодны быць нашым капітанам.

— Капітанам, кажаш? — Яшка пачухаў патыліцу. — А чаму б і не. Капітанам дык капітанам!

У пацвярджэнне праўдзівасці яго слоў непадалёку ўскалыхнулася вада — у яе бухнулася дрэва. Гэта расстараліся Яшкавы браты. Вострай пілой адзін з іх падрэзаў ствол, другія ачышчалі яго ад галін. Не забавіліся бабры, хуценька прыкацілі бервяно да берага, а за ім — яшчэ і яшчэ.

— Як здорава! — узрадавалася Кася. — Я ў інтэрнэце чытала, што самыя простыя чаўны раней такімі і былі — з бярвення. І называліся яны плытамі.





Пакуль сябры занятыя нарыхтоўкай будаўнічага матэрыялу, давайце разбяромся, чым човен адрозніваецца ад плыта.

Як правільна сказаў Яшка, бервяно не тоне ў вадзе. Нагадаем, што вага дрэва меншая, чым вага вады таго ж аб'ёму. Але на адным бервяне не паплывеш – яно няўстойлівае і круціцца, на ім доўга не ўтрымаешся. Калі замацаваць дошкай некалькі бярвён, атрымаецца ўстойлівая пляцоўка – плыт.

Плыт просты ў пабудове. Змайстраваць човен значна складаней. Драўляныя чаўны робяць са шчыльна падагнаных адна да адной дошак. Такім чынам атрымліваецца прыгожы доўгі корпус. А ўвогуле чаўны бываюць пластыкавыя, металічныя, а яшчэ надзіманыя, як той, на якім плаваў і перакуліўся Цішка.

## Давайце правядзём эксперымент.

Нам спатрэбіцца некалькі палачак (можна папытацца ў бацькоў, дзе іх узяць). Дарэчы, падыдуць нават дубцы ад старога веніка або алоўкі. Змацуйце іх паміж сабой аркушам паперы, каб атрымалася пляцоўка. Паперу змажце клеем ПВА. Калі ён высахне, паверхня стане водатрывалай. У нас атрымаецца маленькая мадэль плыта. Яна – рабочая! Апусціце ваш плыт на ваду, пакладзіце на яго які-небудзь груз (пластыкавую цацку або манеткі). Вызначце, колькі карыснага грузу можа ўтрымаць ваш плыт, пакуль пад яго цяжарам не схаваецца пад ваду.

### Заўвага.

Не забудзьцеся адразу ж пасля нанясення клею вымыць пэндзлік. Калі клей высахне на валасінках, пэндзлік давядзецца выкінуць.

— Дзякуй, сябры-бабры! — Цішка ажно падскокваў ад радасці — з бярвён ужо вырасла цэлая гара. Ён паспрабаваў на яе залезці. Але як ні караскаўся (паверхня была мокрай, а таму слізкай), у рэшце рэшт скаціўся ўніз.

— Твая праўда, Кася, зараз нам працей за ўсё зрабіць плыт — бярвення ўдосталь, — як быццам згаджаўся Яшка. — На будаўніцтва чоўна сапраўды спатрэбіцца больш часу і намаганняў, — разважаў абачлівы бабёр. — Але ж ён будзе больш надзейны, чым плыт.

Толькі выходзіла, што гаварыў гэта Яшка сам сабе. Цішка з Касяй спяшаліся хутчэй адправіцца ў падарожжа, і плытом — яны думалі — якраз і абыдуцца.

— Мы пабудуем плыт! Паплывем разам! — мітусілася туды-сюды шчаслівая вавёрачка, паддаючы імпэту агульнай справе.

Яшка падазваў братоў-баброў. Яны перабралі бярвенцы і падагналі іх акурат адно да аднаго. Паклалі зверху папярэчныя дошкі, а затым забілі ў іх тоўстыя драўляныя цвікі — нагелі.

Цішка таксама прылаўчыўся і ў цэнтры плыта прыстроіў высозны шост з ляшчыны. Вавёрачка імгненна ўскочыла на самы верх і прымацавала там каляровую стужку-сцяжок. Цяпер сябры займелі карабель з мачтай гатовы да адплыцця!



Напрацаваны дзень хіліўся да вечара, пазяхнула ажно само руплівае сонейка. Яшка з Цішкам таксама ледзьве рухаліся ад стомы. І вавёрачка прытамілася. Усёй камандай вырашылі старт адкласці на заўтра. Да ўсяго, неабходна было атрымаць згоду ад бацькоў на такое адважнае падарожжа. Папрасілі бярозу-шаптуху, каб тая прыглядзела за іх суднам — раптам хто надумае пасвавоііць…

Наступнай раніцай ніхто не заспаў. Кожны прынёс торбачку з назапашанай у дарогу правізіяй, запас цёплага адзення. Кася нават прыхапіла бінокль, які ёй пазычыў дзядзька Міша.



Цішка прыйшоў з бацькам — ратавальнікам Янушам. Той спрактыкаваным вокам агледзеў плыт і прамовіў:

— Вы б, рабяты, не спяшаліся. Я раю вам лепш зладзіць човен — на ім плыць надзейней.

Але сябрам не цярпелася хутчэй адправіцца ў плаванне. Бабёр Яшка ўжо па-капітанску аддаваў каманды. Янушу нічога не заставалася, як даць дабро на падарожжа. У адпаведнасці з правіламі паводзінаў на вадзе ён паклаў на плыт выратавальныя камізэлькі.

Калі сябры ўладкаваліся на плыце, шчанюк і бабраня ўзялі шасты, каб адштурхнуцца ад берага. Ззаду падплылі Яшкавы браты, паднатужыліся, і ўсе разам яны далі «караблю» ход.

Плыт павольна аддаляўся ад берага. Адплыўшы на некалькі соцень метраў, ён раптам замёр на месцы. Стаяла добрае надвор'е. Па воднай роўнядзі беглі ледзь прыкметныя хвалькі. Яшка з Цішкам паспрабавалі падштурхнуць плыт шастамі, але тыя не даставалі да дна.

— Яша, а чаму мы не рухаемся? — седзячы на мачце, запыталася назіральніца Кася.

— Вось, сябры, мы і пападарожнічалі… — адазваўся расчараваны Яшка. — На жаль, спраўдзілася маё падазрэнне: на плыце мы далёка не даплывем. Няма спадарожнага ветру — і «карабель» наш нерухомы.

Сонца падымалася ўсё вышэй, пачынала прыкметна прыпякаць. Разгарачаная Кася спусцілася з мачты, бо сядзець там зараз не было аніякага сэнсу. Сябры і назагараліся, і торбачкі з ежай значна аблегчылі. А плыт тым часам стаяў практычна на адным месцы...



— Эх, вуду б сюды, — уздыхаў Цішка, — налавіў бы рыбы. Хоць які быў бы толк.

Як раптам па небе прабегла адна смуглявая хмурынка, за ёй — другая, трэцяя. Яны нібыта выйшлі на разведку, ці патрэбны ў гэтых мясцінах дождж. А як жа? Ужо колькі дзён стаяў сухмень, і дрэвы, травы ды кветкі праглі вільгаці. Хмурынкі вярнуліся назад, і ім наўзамен высунулася вялізная шэра-сіняя хмара. Пра яе з'яўленне паведаміў сам Пярун, грымнуўшы ў свой бубен і пусціўшы на ўсё неба некалькі вогненных стрэл.

Сябры занепакоіліся. Яны зразумелі, што набліжаецца навальніца. Чаго ім чакаць ад яе?

— Хутчэй апранайце выратавальныя камізэлькі! — не разгубіўся Яшка.

Толькі яны паспелі іх зашпіліць на сабе, як наляцеў шквалісты вецер. Ён з усяго размаху кідануў плыт так, што той хутка ўрэзаўся ў густа аблеплены зараснікам чароту і хмызняку бераг. Дождж лінуў як з вядра, а па вадзе ён быццам лупцаваў пугай. Намоклы плыт увагнуўся пад пахіленай мачтай.

Калі падарожнікі ачомаліся ад перапуду, зразумелі, што да свайго берага ім давядзецца дабірацца ўплаў. Прабіцца праз зараснік у іх аніяк бы не атрымалася.

— Я вады баюся, — прызналася і без таго збянтэжаная Кася.



— У такім разе трымайся за мяне, — прапанаваў Цішка. Ён скокнуў у ваду, наблізіўся да плыта, і Кася, павесіўшы бінокль на шыю, каб не намачыць, асцярожненька спусцілася на ягоныя плечы. Следам за імі паплыў Яшка.

Здалёк былі бачныя ярка-аранжавыя камізэлькі, якія набліжаліся да берага, дзе бяроза-шаптуха махала сваімі галінамі — сігналіла сябрам, каб хутчэй вярталіся дадому.

Сумаваць падарожнікам не даў бабёр Яшка. Назаўтра, ледзь пачало днець, ён, стоячы на беразе ля скрынкі са сваім інструментам, ужо даваў



загады братам, як лепш раскласці бярвенцы, каб тыя як след прасохлі. Дарэчы, браты-бабры ноч не паспалі — вярнулі іх з месца катастрофы плыта. З'явіліся і Цішка з Касяй. Яны трымаліся бадзёра, перакананыя ў тым, што цяжкасці іх загартавалі. Разам з імі прыйшоў і Януш. Ён вырашыў узяць над сябрамі апеку. Як вядома, з бацькамі надзейней у любой справе.

— Мы набраліся вопыту і зараз зробім судна такім, каб яно рухалася не толькі па плыні, але і супраць яе! — Яшка, здаецца, стаў яшчэ больш упэўненым і сур'ёзным капітанам.



А мы давайце падумаем: чаму на вёсельных чаўнах вясляр сядзіць спінай наперад?

Як вядома, на індзейскіх пірогах і каноэ, а таксама на байдарках вяслуюць, седзячы тварам наперад. Аднак калі човен з вялікімі вёсламі, і яны ўстаўлены ў адмысловыя адтуліны, то зручней сесці тварам да задняй часткі корпуса, так званай кармы. Тады вясляр робіць намаганне, падцягваючы вёслы да сябе, у чым яму дапамагаюць і мускулы ног. Калі ж сядзець тварам да носа чоўна, то ўся нагрузка будзе толькі на рукі.



— Нам трэба прыняць рашэнне! — Яшка раскрыў тэчку з чарцяжамі, што дагэтуль ляжала на пяньку, і стаў тлумачыць, якім можа быць човен: шырокі, з гладкім і плоскім дном, або вузкі, падбіты жалезам.

— Мяркую, у вашай сітуацыі лепш рабіць човен шырокім, каб усе маглі зручна размясціцца ў ім, — выказаў сваё меркаванне Януш, і ў знак згоды з ім усе дружна заківалі галовамі.

Кася ўзяла дубчык і пачала на пяску вымалёўваць абрысы чоўна.

— Я хачу, каб ён мог нават скакаць па хвалях, — прытанцоўвала вавёрачка вакол свайго малюнка.

— А ён зможа гэта рабіць, калі мы прымацуем да яго бакоў вёслы, — падказаў Януш.

— Так, вось зірніце, вёслы ёсць і на маім чарцяжы, — падаў голас капітан Яшка. Ён нават ссунуў капялюшык з патыліцы на лоб, каб сонца не перашкаджала яго інжынерным думкам.

Януш, як старэйшы і як ратавальнік, добра знаёмы з водным транспартам, параіў у першую чаргу звярнуць увагу на матэрыял, з якога будзе будавацца човен. Для бартоў дошкі варта браць тонкія, каб гнуліся, а тоўстыя пойдуць на дно. Вельмі важна не забыцца пра сродкі абароны ад працечак, элементы для змацоўвання ўсіх дэталяў канструкцыі.

Яшка хоць і лічыў сябе знаўцам, але слухаў парады дзядзькі Януша, натапырыўшы вушы.

## Давайце правядзём дослед.



Возьмем тазік з вадой і апусцім у яго пустую металічную міску. Яна паплыве, нібыта човен.

А зараз нальем у міску вады. Яна патоне. Гэта і не дзіўна – матэрыял, з якога яна зроблена, цяжэйшы за ваду.

Човен – нібы тая ж міска. Унутры яго паветра, якое, у параўнанні з вадой, амаль нічога не важыць. Калі апусціць човен у ваду, ён часткова пагрузіцца ў яе за кошт сваёй вагі, але застанецца на плыву. А калі раптам з´явіцца прабоіна, і човен запоўніцца вадой? Металічны – патоне. А драўляны застанецца на паверхні, бо шчыльнасць дрэва меншая за шчыльнасць жалеза. Дрэва менш шчыльнае і за ваду, таму яна яго і выштурхвае. Вось чаму драўляны човен трымаецца на вадзе.

— Так, дошкі трэба шчыльна змацоўваць, каб вада не прасочвалася, — дадаў Яшка. — І вёслы павінны быць з гэтымі, як іх...

— Уключынамі і падуключынамі, — падказала вавёрка, якая за гэты час адшукала патрэбную інфармацыю ў інтэрнэце.

— Але найперш, сябры, вам варта вызначыцца з памерамі чоўна, — аўтарытэтна заўважыў Януш. — Пакажы, Яшка, што там на тваім чарцяжы!

Усе ўтаропіліся ў Яшкаў малюнак.

— Ну, так і ёсць, вышыня борта складае паўметра. Даўжыня — амаль два метры, шырыня — амаль паўтара метра, — ухваліў чарцёж чоўна Януш.

— Дзе ж нам цяпер дошкі на яго здабыць? — задумаўся Яшка.

— Я дамоўлюся з быком Восіпам. Ён жа ў нас на пілараме працуе і напілуе дошак патрэбнага памеру, — сказаў Януш. — І іншыя неабходныя дэталі змайструе. Ты, Яшка, пойдзеш са мной, а вы будзьце напагатове, каб майстраваць човен!



## Давайце і мы зробім мадэль чоўна!

Сфатаграфуйце чарцёж чоўна, раздрукуйце яго. Акуратна выражце нажніцамі, сагніце па лініях і склейце клеем ПВА. Калі клей высахне, вазьміце пэндзлік і нанясіце яшчэ адзін тонкі слой звонку і ўнутры. Як толькі мадэль прасохне, яе можна будзе апусціць у посуд з вадой. Ледзьве не забыліся! Перад нанясеннем клею напішыце на борціку назву чоўна. Нездарма ж кажуць: «Як карабель назавеш, так ён і паплыве!»



Прайшло ўсяго некалькі гадзін, і вось браты-бабры ўжо везлі перад сабой тачку, паўнюткую патрэбнага на збудаванне чоўна матэрыялу. Следам за імі шыбавалі Януш з Яшкам.

Калі каштоўны груз быў раскладзены на беразе, адразу ж закіпела работа. Яшка яшчэ раз перагледаў кожную дошку, бо для чоўна прынцыпова важна, каб у ёй не было аніякага сучка, які пазней можа вываліцца і даць цеч.

Пачалі з насавой часткі. Кожную дошку сагнулі, а потым прыціснулі іх як мага шчыльней адна да адной, каб не было ні шчылінак, ні трэшчын. Прапіталі дошкі некалькімі слаямі антысептыку.

Аснову для носа зладзілі з трохвугольнага бруска. Ён, па правілах, атрымаўся ў паўтара раза шырэй за барты чоўна. Яго таксама пакрылі антысептыкам, каб засцерагчы човен ад магчымых шкоднікаў і падоўжыць тэрмін яго службы.

На задні борт пайшлі больш шырокія дошкі.

Цяпер, калі аснова была падрыхтавана, Яшка даў каманду па канчатковай зборцы канструкцыі.

Януш, бачачы, як спорна ідзе работа, адышоў убок і з захапленнем назіраў за ўвішнымі сябрамі.

— Зараз надышоў вельмі адказны момант, — хваляваўся Яшка. — Для таго, каб наш човен атрымаўся правільнай формы, давайце паставім распорку і сагнём бакавыя барты.

Літаратурна-мастацкае выданне

**Матвіенка** Анатоль Яўгенавіч
**Стэльмах** Алена Анатольеўна

# ЯК СЯБРЫ БУДАВАЛІ ЧОВЕН

Казка з заданнямі

Рэдактар *Ю. А. Аверчанка*
Мастацкі рэдактар *Н. Р. Агародная*
Тэхнічны рэдактар *С. Л. Печанёва*
Карэктар *В. Г. Багуцкі*

0+

Падпісана да друку 27.12.2021. Фармат 84×100 1/16.
Папера мелаваная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 4,68. Ул.-выд. арк. 5,38. Тыраж 1000 экз. Заказ 540.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.



978-985-01-1494-5
9 789850 114945

ЕАС